Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Менску працягваюцца суды і пераслед грамадскіх актывістаў (абнаўляецца)

08.05.2014 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, апазіцыя, хакей-2014



Да мадэратара суполак “Надакучыў нам гэты Лукашэнка” і “Толькі ШОС!” **Сяргея Бяспалава** ўчора ўвечары ў кватэру ламіліся супрацоўнікі міліцыі.

Як паведаміў ягоны сябар Раман Пратасевіч, міліцыянты каля 22.00 выламалі дзверы. Сяргей выскачыў з акна спальні і змог адарвацца ад іх. Бацькоў і дзяўчыну Сяргея адвезлі ў РУУС Фрунзенскага раёна Мінска, дзе пасля допыту адпусцілі. Сяргей зараз знаходзіцца ў вельмі бяспечным месцы. Там, дзе яго дакладна не знойдуць.

Нагадаем, учора ў Савецкім судзе Менска судзілі **Андрэя Ткачова**, вядомага раней, як мадэратара суполак «Толькі ШОС!» і «Надакучыў нам гэты Лукашэнка» ў сацыяльнай сетцы «Укантакце». Супрацоўнікі міліцыі склалі пратаколы адміністратыўнах правапарушэнняў па “класічных” артыкулах для апазіцыі: 17.1 (дробнае хуліганства) і 23.4 (непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі). Паколькі на суд нікога не пусцілі, зараз праваабаронцы высвятляюць ягоны далейшы лёс. Суддзя Якубоўскі пакараў актывіста арыштам на 15 сутак.

Міліцыя Партызанскага і Савецкага РАУСаў сталіцы працягвае пошукікіраўніка Маладых хрысціянскіх дэмакратаў **Марыны Хоміч** і тэрарызаваць яе знаёмых. Супрацоўнікі міліцыі наведваюць знаёмых Марыны і нават зазіраюць у шафы, калі тыя, кажуць, што Марыны ў іх няма. Зачэпкамі для ўваходу супрацоўнікі міліцыі называюць званкі са скаргамі на гучную музыку, якія паступілі нібыта ад суседзяў. Пасля візіту да яе сваякоў 5 траўня старшыне аргкамітэту МХД патэлефанаваў аперупаўнаважаны, які запрасіў яе прыйсці на апытанне.

8 траўня сустаршыня аргкамітэту па стварэнні партыі "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" **Павал Севярынец** быў выкліканы ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю Фрунзенскага раёну Менска, дзе яму вынеслі афіцыйнае папярэджанне аб недапушчальнасці супрацьпраўных дзеянняў. Павал Севярынец

звязвае гэта з чэмпіянатам свету па хакеі, які пачнецца заўтра ў Менску.

Міліцыя расшуквае таксама актывіста «Zмены» **Ягора Віняцкага**, аднак дома яго няма.

***

У судзе Маскоўскага раёна Мінска разглядаецца адміністратыўная справа актывіста "Еўрапейскай Беларусі" **Сяргей Мацкойця**. Супрацоўнікі міліцыі забралі яго з дому і адвезлі ў РУУС. Яго вінавацяць у парушэнні артыкула 17.1 КаАП (дробнае хуліганства) и 23.4 (непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі). Прысуд - 20 сутак арышту.

У судзе Фрунзенскага раёна Мінска пачнуцца суды над сацыяльнымі актывістамі **Настассяй Кухта і Аляксандрам Арловым** (арт17.1 і 23.4 КаАП).

Настассі Кухто (суддзя Юля Закрэўская) прысудзілі 17 сутак арышту, Арлову (суддзя Лапо)- 20 сутак арышту.

У судзе Першамайскага раёна Менска разглядаецца адміністратыўная справа актывіста кампаніі "Еўрапейская Беларусь" **Леаніда Кулакова**. Ён быў затрыманы ўчора ў другой палове дня і дастаўлены ў Першамайскі РУУС. Суддзя - Юрый Гарбатоўскі. Прысуд - 10 сутак арышту.

8 траўня ў Гародні ў судзе Кастрычніцкага раёну адбыўся разгляд адміністрацыйных пратаколаў у дачыненні да сябра “Маладога Фронту” **Станіслава Рачкеля** і ягонага сябра. Суддзя Алена Тоўсцік-Самойла не захацела ўзяць пад увагу акалічнасці справы і засудзіла абодвух нібыта за дробнае хуліганства да 10 сутак адміністрацыйнага арышту.

13-25. Чарговыя затрыманні актывістаў: прадстаўнік нацыянал-бальшавісцкага руху **Зміцер Паліенка** ў Менску, актывіст "Маладога фронту" са Слоніма **Зміцер Юшкевіч**, **Уладзіслаў Запасаў**.

Суд Заводскага раёна Менска асудзіў Уладзіслава Запасава на 15 сутак арышту.

14-30. Сустаршыню аргкамітэту па стварэнні партыі "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" **Віталя Рымашэўскага** выклікаюць у Савецкі РАУС Менска. Не выключана, што гэта звязана з перасследам апазіцыйных актывістаў напярэдадні чэмпіянату свету па хакеі.

16-30. У суд Заводскага раёна нарэшце прывезлі Зміцера Паліенку. Прысуд - 10 сутак арышту. Суддзя Някрасаў. Абвясціў галадоўку.

16-55. Былога палітвязня Сяргея Марцэлева сёння позвай выклікалі ў аддзяленне міліцыі.

20-20. У судзе Ленінска раёна Менска асуджаны **Сяргей Казако**ў. Прысуд – 20 сутак арышту.

У Слоніме асудзілі З**міцера Юшкевіча**. Прысуд – 20 сутак арышту.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 958 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)
Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)
Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе ААН пра Беларусь?

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

